ЦБС г. Гродно

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна”
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу
ЦБ імя А. Макаёнка

# Напалеон Орда:

## мастак, кампазітар, педагог

2015



Напалеон Орда: мастак, кампазітар, педагог: [сцэнарна-метадычны дапаможнік] / Гродзенская гарадская центральная бібліятэка імя А.Макаёнка; уклад. Н.Ю. Наземцава. – Гродна, 2015. – 16 с.

*Выданне будзе карысна бібліятэкарам, настаўнікам, усім, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі, хто неабыякава ставіцца да беларускай культурнай спадчыны.*

# Біяграфічныя звесткі

*Напалеон!*
*Тваё імя ніхто ніколі не забудзе*
*Яго ўслаўляць заўседы будзе*
*Твая Радзіма і зямля.*
***А. Крэйдзіч***



Напалеон Орда - выдатны піяніст, кампазітар, мастак, педагог, публіцыст, вучоны. Вялікі грамадзянін Еўропы з Варацэвічаў сваёй нястомнай дзейнасцю, усім, што паспеў зрабіць за сваё больш чым паўвекавое творчае жыццё, выклікае гонар і павагу ў сэрцах нашчадкаў. У якім бы відзе мастацтва ён не тварыў, усюды ўражвае дасканаласцю і высокімі пачуццямі.

Спадчына Напалеона Орды настолькі вялікая і значная, што сучаснікі па праву называлі яго зоркай першай велічыні еўрапейскай культуры XIX стагоддзя.

Нарадзіўся будучы мастак у вёсцы Варацэвічы Пінскага павета Мінскай губерніі (цяпер Іванаўскі раён Брэсцкай вобласці) у сям'і кобрынскага маршалка, інжынера-фартыфікатара. Бацькі не стала, калі Напалеону было два гады. Выхоўвала будучага мастака маці — Юзэфа Бутрымовіч, дачка пінскага старасты. Пачатковую адукацыю юнак атрымаў у бацькоўскім доме, затым прадоўжыў навучанне ў знакамітай Свіслацкай гімназіі. У 1823 годзе паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Віленскага ўніверсітэта. Але закончыць вышэйшую навучальную ўстанову не давялося. Падчас вучобы Напалеон стаў членам тайнага студэнцкага таварыства "Заране". За ўдзел у гэтым таварыстве ён быў выключаны з 4-га курса ўніверсітэта і арыштаваны. Разам з Ордам з універсітэта былі адлічаны і іншыя знакамітыя асобы беларуска-польскай гісторыі: Адам Міцкевіч, Ігнат Дамейка, Ян Чачот. Амаль 15 месяцаў Напалеон Орда правёў у Віленскай турме. Пасля вызвалення вярнуўся ў родную вёску, дзе знаходзіўся пад наглядам паліцыі. У 1830-1831 гг. адбылося нацыянальна-вызваленчае паўстанне за аднаўленне Рэчы Паспалітай, у якім Напалеон Орда прыняў актыўны ўдзел: камандаваў

партызанскім атрадам, з'яўляўся стралком коннай гвардыі Літоўскага корпуса ў Польшчы. Асабліва вызначыўся Напалеон Орда ў бітве пад Коцкам, за што атрымаў вышэйшую ўзнагароду — ордэн Залатога крыжа і чын капітана паўстанцкай арміі. Расійскімі ўладамі Орда за ўдзел у паўстанні быў далучаны да ліку мяцежнікаў і падлягаў ссылцы ў Сібір. Аднак Напалеону ўдалося пад чужым іменем эмігрыраваць у Еўропу. Жыў у Аўстрыі, Швейцарыі, Італіі, Францыі. У 1833 годзе Напалеон Орда атрымаў статус эмігранта і застаўся ў Францыі. Там ён пазнаёміўся з многімі знакамітымі дзеячамі еўрапейскай культуры: Ф. Шапэнам, Ф. Лістам, Дж. Расіні, Дж. Вэрдзі, Ж. Гуно, Г. Берліёзам, А. Бальзакам, А. Стэндалем, П. Віярдо, І. Тургеневым. Паводле сведчанняў гісторыкаў, за мяжой Напалеон Орда разам з Фрэдэрыкам Шапэнам музыцыраваў на вечарах у доме Чартарыйскіх, суправаджаў ігрой на фартэпіяна паэтычныя імправізацыі Адама Міцкевіча. Талент музыканта і кампазітара быў заўважаны: Напалеона Орду прызначылі на пасаду дырэктара Італьянскай оперы ў Парыжы.

У 1843 годзе мастак ажаніўся з францужанкай Ірэнай Багле. У 1856 годзе пасля аб'яўлення расійскім імператарам Аляксандрам ІІ амністыі эмігрантам Напалеон Орда пакінуў сям'ю, забяспечанае жыццё і паспяховую кар'еру і вярнуўся на радзіму. Пасля смерці маці радавы маёнтак у Варацэвічах быў канфіскаваны. Прычынай паслужыў удзел Н. Орды ў паўстанні. Адзінае, што дазволілі ўлады мастаку, — узяць маёнтак у арэнду. Пазней мастак пэўны час (1862-1863 гг.) жыў у Гродне, затым пераехаў на Валынь (гістарычная вобласць на севера-захадзе сучаснай Украіны), дзе працаваў хатнім настаўнікам музыкі.



У 1866 годзе мастак зноў быў арыштаваны па падазрэнні ва ўдзеле ў нацыянальна-вызваленчым паўстанні 1863-1864 гг. і пасаджаны ў Кобрынскі турэмны замак. У 1867 годзе ваенна-палявы суд прыгаварыў Орду да высылкі ў аддаленыя губерніі Расіі. Аднак дзякуючы намаганням жонкі і пасла Францыі прыгавор адмянілі. Улады пазбавілі мастака права арэнды і пражывання ў радавым маёнтку. Напалеон вымушаны быў пасяліцца ў сваякоў — у сваёй сястры, памешчыцы Гартэнзіі Скірмунт у маёнтку Моладава Кобрынскага павета.

Памёр Напалеон Орда ў 1883 годзе ў Варшаве. Паводле завяшчання, яго пахавалі ў Янаве (цяпер горад Іванава Брэсцкай вобласці) у радавым склепе.

Доўгі час імя нашага славутага земляка замоўчвалася на радзіме. І толькі ў незалежнай Беларусі гістарычная праўда была вернута. У горадзе Іванава Брэсцкай вобласці пастаўлены помнік мастаку, яго іменем названы вуліцы ў Мінску, Брэсце, Гродна, Іванава. У 1996 годзе на скрыжаванні шляхоў Лунінец – Брэст – Снітава ўсталяваны паказальны знак "Родныя мясціны Н. Орды". У гэтым жа годзе імя мастака прысвоена Іванаўскай дзіцячай школе мастацтваў. У 2004 годзе на навуковай аснове пад эгідай Акадэміі навук Беларусі археолагам Валянцінам Собалем былі праведзены раскопкі дома-сядзібы сям'і Напалеона Орды ва ўрочышчы Чырвоны Двор. На месцы былой сядзібы ўсталяваны паказальны знак. У 2007 годзе ў вёсцы Варацэвічы была адкрыта карцінная галерэя Напалеона Орды. І ў гэтым жа годзе былі ўведзены ў абарачэнне памятныя манеты "Напалеон Орда. 200 гадоў". Адна з работ мастака — Нясвіжскі замак Радзівілаў — адлюстравана на грашовай купюры вартасцю ў 100 тысяч беларускіх рублёў.

Пра сусветнае прызнанне творчасці Напалеона Орды сведчыць той факт, што па рашэнні міжнароднай арганізацыі ЮНЕСКА 2007 год быў аб'яўлены Годам Напалеона Орды, выдатнага дзеяча беларускай і еўрапейскай культуры. У 2012 годзе Белтэлерадыёкампаніяй быў выпушчаны 4-х серыйны дакументальны фільм «Эпоха Напалеона Орды».


1. Орда Напалеон // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2000. – Т. 11. – С. 443-444.
2. Орда Напалеон // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1999. – Т. 5. – С. 119-120.
3. Орда Напалеон // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. – Мінск: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1987. – Т. 4. – С. 119-120.
4. Акаловіч, Л. Да радаводу Напалеона Орды // Краязн. газета. – 2010. – № 9. – С. 5.
5. Асіноўскі, С. Напалеон [Орда] з беларускага Палесся // Архівы і справаводства. – 2012. – №2. – С. 136-144.
6. Бадак, А. Наполеон Орда (1807–1883) // Неман. – 2010. – № 2. – обложка.

7. Берасцень, С. Загадка Напалеона: [да 205-годдзя Напалеона Орды] // Літаратура і мастацтва. – 2012. – 10 лют. (№6). – С.18.

8. Берасцень, С. Сцежкамі Напалеона // Літаратура і мастацтва. – 2011. – № 35 (2 верасня). – С. 18.

9. Ільянкоў, В. Орда з альбома Дэнармандзі // Культура. – 2009. – 24-30 кастр. – С.14.

10. Карлюкевіч, А. Свіслач, Поразава, Шамятоўка // Карлюкевіч, А. Радзімазнаўства. Мясціны. Асобы : краязнаўчыя нарысы / Алесь Карлюкевіч. – Мінск, 2010. – С. 148-152.

11. Катовіч, А. Орды: [знакамітыя рады] // Звязда. – 2013. – 2 крас. (№ 60). – С. 6.

12. Ковалив, В. В. Ян Давид Голланд, Осип Антонович Козловский, Напалеон Орда, Михаил Карлович Ельский, Камилла Винцентовна Марцинкевич / В. В. Ковалив // Пачатковае навучанне. Серыя "У дапамогу педагогу". – 2014. – № 3. – С. 76-80.

13. Мазго, У. Беларускі Напалеон: [верш пра Напалеона Орду] // Полымя. – 2012. – № 7. – С. 61-62.

14. Мароз У. Згадкі пра Напалеона Орду // Мароз У. За брамай забытых мелодый: эсэ, вершы, мініяцюры. – Мн., 2004. – С.129.

15. Наполеон Орда в Аргентине // Перспектива (Гродненский район). – 2010. – 27 янв. – С. 2.

16. Новые улицы // Гродзен. праўда. – 2011. – 20 ліп. – С. 6

17. Чаропка В. Напалеон Орда: выдатны беларускі музыка і мастак / Віктар Чаропка. – Мн.: Харвест, 2007. – 64 с. – (100 выдатных дзейчаў культуры).

18. Ягоўдзік, У. Напалеон Орда // Ягоўдзік, У. Выбранае. – Мн., 2005. – кн. 2. – С. 67-69.



**Напалеон Орда — мастак**. Напалеон шмат падарожнічаў па Беларусі, Украіне, Літве і Польшчы і рабіў замалёўкі мясцін, звязаных з жыццём вядомых людзей, а таксама архітэктурных помнікаў. Таму яго творы вызначаюцца строгай дакументальнасцю і служаць каштоўнай крыніцай для гісторыкаў архітэктуры і рэстаўратараў. Тым больш, што ў наш час шматлікія аб'екты, адлюстраваныя мастаком, ужо не існуюць або значна відазмяніліся. Мастацкая спадчына Напалеона Орды налічвае больш за 1150 акварэляў і графічных работ. Сярод работ мастака асобнае месца займаюць замалёўкі Камянецкай вежы, Горы-Горацкага земляробчага інстытута, Бернардзінскага манастыра ў Віцебску, сядзіб і палацаў у Міры, Навагрудку, Нясвіжы, Гродне і інш. Свае малюнкі мастак сістэматызаваў па папках, у якіх сабраны творы за саракагадовы перыяд творчасці. У асобных папках знаходзяцца творы па Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай, Віленскай, Магілёўскай губернях, а таксама па Валынскай, Кіеўскай, Падольскай, Ковенскай губернях, Заходняй Прусіі, Галіцыі, Францыі, Іспаніі, Партугаліі і Германіі.

Значная калекцыя літаграфій з малюнкаў Н. Орды змешчана ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, але большая частка работ мастака (977 твораў) знаходзіцца ў Нацыянальным музеі Кракава (Польшча), у Народным музеі ў Варшаве. Альбом акварэляў таксама ёсць у бібліятэцы В. Стафаніка ў Львове (Украіна).

***<u>Што чытаць пра Н. Орду –мастака</u>***

1. Баравікова Р. Да графічных малюнкаў Напалеона Орды: [верш] // ЛіМ. – 2012. – 10 лют. (№6). – С. 1
2. Беларусь у малюнках Напалеона Орды : другая палова XIX стагоддзя : [альбом]. – Мінск : Ураджай , 2001. – 143 с.
3. Белко, Ю. Анёл–ахоўнік Беларусі // Літаратура і мастацтва. – 2010.– № 37 (17 верас.). – С. 12. – (Зямля пад белымі крыламі).
4. Берасцень С. Загадка Напалеона: [ да 205–годдзя з дня нараджэння Н.Орды] // ЛіМ. – 2012. – 10 лют. (№6). – С. 18.
5. Бунцэвіч, Н. Напалеон Орда : каляровая графіка на аркестравы манер / Н. Бунцэвіч // Культура. – 2007. – 27 студз.– 2 лют. – С. 8.
6. Гібок–Гібкоўскі А.С. Напалеон Орда. Гісторыя, захаваная ў фарбах // Нар. асвета. – 2010. – №9. – С. 82-85.
7. Дорская А. Яркае вяртанне : [пра альбом “Напалеон Орда. Шлях да бацькаўшчыны”] / Саша Дорская // ЛіМ. – 2010. – 5 лют. (№5). – С. 1.

8. Загідуліна М. Постаць : [да 200–годдзя з дня нарджэння Н. Орды] // Гродзен. праўда. – 2007. – 22 лют. (№22). – С. 4.
9. Кенько Т. Остались только на рисунках… или как в Беларуси XXI столетия используется наследие Наполеона // Бібліятэка прапануе. – 2006. – №6. – С. 2-5.
10. Киреева Г. Творческое наследие Наполеона Орды в фондах Национальной библиотеки Беларуси / Галина Киреева, Татьяна Рощина, Алесь Суша // Біблятэчны свет. – 2007. – №1. – С. 22-24.
11. Напалеон Орда : з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі : [альбом]. – Мінск : Беларусь, 2006. – 163 с.
12. Наполеон Орда в Аргентине: [о выставке репродукций картин художника в г. Резистенция в Аргентине] // Перспектива (Гродненский район).– 2010. – 27 янв. – С. 2
13. Несцярчук Л. М. Напалеон Орда. Шлях да Бацькаўшчыны : альбом / Леанід Несцярчук. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2012. – 430 с.
14. Пракопчык, Л. Ц. “Зрысавана з натуры“ / Л. Ц. Пракопчык // “Дрэмле памятка дзён...“ : краязн. нарысы. – Мінск : Полымя, 1991. – С. 92-105.
15. Харэўскі С. Зброя памяці і паўстання / Сяргей Харэўскі // Мастацтва. – 2015. – №3. – С. 46-47.
16. Чернякевич, А. Художник и Город / Андрей Чернякевич, Андрей Вашкевич; фото // Вечерний Гродно. – 2013. – 27 февр. – С. 29.

**Напалеон Орда — кампазітар.** Напалеон Орда напісаў вялікую колькасць музычных твораў — паланэзы, вальсы, мазуркі, серэнады, якія вылучаюцца самабытным і віртуозным стылем. Ствараў рамансы і песні, выдаў “Альбом твораў польскіх кампазітараў” (1838), “Граматыку музыкі” (Варшава, 1873). У сярэдзіне 1840-х гг. быў дырэктарам Італьянскай оперы ў Парыжы. Аўтар многіх фартэпіянных твораў, у тым ліку больш за 20 канцэртных паланэзаў, якія гучалі са сцэн у Францыі, Германіі, Польшчы, Беларусі. Напісаў мноства вальсаў, прасякнутых тонкай лірыкай, полек, мазурак і іншых інструментальных і вакальных твораў.

***Што чытаць пра Н. Орду –кампазітара***

1. Дадзіёмава, В. Шапэн ў гісторыі культуры Беларусі // ЛіМ. – 2009. – 6 лістап. ( № 42 ). – С. 11.
2. Капилов, А.Л. Наполеон Орда (1807–1883) / А.Л. Капилов, Е.И. Ахвердова // Музыкальная культура Беларуси XIX – начала XX веков. – Минск : ИСЗ, 2000. – С. 29-37.

3. Мароз, У. За брамай забытых мелодый / Уладзімір Мароз // За брамай забытых мелодый : эсэ, вершы, мініяцюры. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. – С. 106–114.

4. Мытько, О. Наполеон Орда // 7 Дней. – 2011. – 8 сент. (№36). – С.12.

5. Скоробогатов, В. Таленты і дасягненні Напалеона Орды // Партер. – 2012. – № 10 (14). – С. 38-39.

6. Скарабагатаў, В. Напалеон Орда / Віктар Скорабагатаў // Зайгралі спадчынныя куранты : цыкл нарысаў з гісторыі праф. муз. культуры Беларусі. – Мінск : Тэхналогія, 1998. – С. 64-66.

**Напалеон Орда — педагог.** Напалеон Орда падрыхтаваў славутую "Граматыку музыкі", якая атрымала высокую ацэнку Станіслава Манюшкі і на працягу многіх дзесяцігоддзяў заставалася неператўзыдзеным вучэбным дапаможнікам па тэорыі музыкі. Знакаміты кампазітар С. Манюшка, пазнаёміўшыся з "Граматыкай музыкі", пісаў: "З асалодай чытаў я працу пра гармонію, выклад якой мне здаецца найбольш поўным і даступным для разумення", і дадаваў "... сканфужаны дабрынёй г. Орды, які прысвяціў мне такую годную ўвагі кніжку". Музычная, педагагічная спадчына Н. Орды перажывае сёння сваё новае нараджэнне. Расце колькасць прыхільнікаў яго музычнага таленту.

**Напалеон Орда — лінгвіст.** Орда з'яўляўся членам Польскага гістарычна-літаратурнага таварыства. Ён перакладаў паэзію аўтараў, ураджэнцаў беларускіх зямель, на французскую мову. Апублікаваў першы (1856 год) падручнік польскай мовы для французаў. "Граматыка польскай мовы" выдадзена ў 1856 г. у Парыжы, затым ў 1858 ў Берліне, а ў 1874 у Варшаве.

*Па артыкуле І. Капылова "Чалавек з незвычайнай біяграфіяй" // Звязда. – 2013. – 2 крас.*

**Напалеон Орда і Гродна.** Аб знаходжанні Орды ў Гродна сёння амаль нічога невядома. Некаторыя даследчыкі лічаць, што ён жыў у нашым горадзе ў 1863-64 гг. Дакладна вядома, што з 15 мая 1866 па красавік 1867 г. Орда знаходзіўся ў гродзенскай турме, куды яго засадзілі расійскія ўлады па падазрэнню ва ўдзеле ў паўстанні 1863 года. Адзін з малюнкаў Орды сапраўды зроблены з двара гродзенскага астрога. Але хутчэй за ўсё асноўную масу гарадзенскіх малюнкаў Орда стварыў ужо пад канец 1860-х ці нават у пачатку 1870-х гг. Гэта бачна таксама і па малюнках мастака, напрыклад, гарадзенскі чыгуначны вакзал быў дабудаваны ў 1867 годзе, таму раней намаляваць яго Орда не мог.



Вялікая каштоўнасць гарадзенскіх малюнкаў Напалеона Орды ў тым, што гэтыя выявы зроблены яшчэ перад тым, як горад масава пачалі фатаграфаваць прафесійныя фатографы. Сёння вядома літаральна некалькі фотаздымкаў Горадні 1860-х гг., ды і ўвогуле, фотаздымкаў горада, зробленых да пажара 1885 года, не так і шмат. Таму і цікавыя нам не толькі выявы манументальных помнікаў дойлідства, такіх як гарадзенскія касцёлы (хаця, напрыклад, гарадзенскі дамініканскі касцёл быў разбураны па загаду расійскіх уладаў літаральна праз пару год пасля таго, як яго намаляваў Орда), але і малюнкі шэраговай забудовы горада, паколькі яе характар цалкам змяніўся пасля пажара 1885 года. На змену драўляным фахверкавым будынкам тады прыйшлі цагляныя дамы, якія мы маем

магчымасць бачыць сёння. Варта звярнуць увагу і на тое, што Орда часта маляваў архітэктурныя помнікі, якія, магчыма, мелі дачыненне і да яго ўласнай біяграфіі. Напрыклад выявы вулачак з драўлянай забудовай на абодвух берагах Нёмана і дамоў маёнткавага тыпу, месцазнаходжанне якіх сёння цяжка лакалізаваць. Гэтыя будынкі маглі быць месцам пражывання сяброў мастака, у якіх ён жыў пад час візітаў у наш горад. У так званым доме Ромера на цяперашняй Савецкай вуліцы арганізоўвалі свае сустрэчы паўстанцы 1863 года, і маляваў гэты дом Орда, удзельнік паўстанняў 1830-31-га і 1863-га гг., калі ў гэтым доме, так бы мовіць, яшчэ не заціхлі крокі Кастуся Каліноўскага.

Нягледзячы на велізарную каштоўнасць для вывучэння архітэктурнай спадчыны Горадні малюнкі Орды робяць ураджанне не заўсёды дакладных. Бачна, што завяршаў свае эскізы мастак ужо не з натуры, а хутчэй па памяці, таму далёка не заўсёды захоўваецца маштаб будынкаў, некаторыя іх архітэктурныя дэталі. Напрыклад, занадта маленькіх памераў атрымаўся ў Орды бернардынскі касцёл, малюнак фасада палаца Сапегаў (так званай "баторыеўкі") на рагу Карла Маркса таксама не зусім адпавядае рэчаіснасці. Па гэтай прычыне самыя дакладныя – гэта ўсёж такі не каляровыя, а графічныя, эскізнага характару, працы мастака.

Тым не менш, малюнкі Напалеона Орды – невычэрпная крыніца ведаў аб нашым горадзе, іх трэба як мага шырэй прапагандаваць сярод гарадзенцаў (рабіць білборды, каляровыя шыльды крамаў, аздабляць імі кавярні і г.д.), каб жыхары роднага горада любілі яго больш і больш ведалі яго багатую гісторыю.

*[Па матэрыялах сайта harodnia.com: http: //harodnia.com/be/uczora/rasijskaja-impieryja/5-hrodna-na-maliunkach-ordy]*

## Прыклады назваў кніжных выстаў, прысвечаных жыццю і творчасці Напалеона Орды

- Свой кут завём мясцінай Орды;
- Беларусь у творах Напалеона Орды;
- Вяртанне Напалеона Орды;
- Напалеон, якім ганарыцца Беларусь;
- Напалеон Орда і яго вобраз Беларусі;
- Напалеон з Палесся;
- "І ў асеннім веку чую тую песню веснавую": [пра музычную спадчыну Напалеона Орды];

- Час, спынены ў малюнку (выстава выяўленчых матэрыялаў) : [архітэктурныя збудаванні, захаваныя ў малюнках Н. Орды, і іх сучасныя фотаздымкі];
- “Я маляваў рэшткі нашай славы і цывілізацыі”;
- Тут нарадзіўся Напалеон Орда...: [старонкі гісторыі маёнтка Варацэвічы];
- Талент, аддадзены Радзіме;
- Літаратару, кампазітару, мастаку прысвячаецца.



## Чалавек з незвычайнай біяграфіяй

Сцэнарый літаратурна-музычнай гасцёўні

*На экране дэманструецца электронная прэзентацыя з выявамі малюнкаў і гравюр Н. Орды*

*Вядучы 1*: Напалеон Орда — дзіўнае імя, у якім еўрапейскі шарм спалучыўся з азіяцкай цвярдыняй. І нездарма — бо радавод яго бацькі ўзыходзіць, па меркаванні некаторых даследчыкаў, да беларускіх татараў, выхадцаў з Залатой Арды, якія прынялі хрысціянства, засвоілі мову, культуру сваёй новай радзімы, якія аддана служылі ёй, абараняючы яе ад захопнікаў, за што атрымлівалі высокія пасады, тытулы і радавыя гербы. А бацька Орды, ужо ўраджэнец Піншчыны, быў вядомым (дарэчы, як і яго зямляк Андрэй Тадэвуш Касцюшка) інжынерам-фартыфікатарам, праекціроўшчыкам ваенных умацаванняў. Гэта ад яго, відаць, атрымаў Напалеон Орда ў спадчыну талент мастака архітэктурных пейзажаў.

*Вядучы 2*: Маці ж кампазітара — прадстаўніца старажытнага беларускага роду, дачка пінскага старасты — Юзэфа Бутрымовіча, праславілася перш за ўсё як таленавітая піяністка. Творчасцю Юзэфы захапляўся сам кароль Станіслаў Панятоўскі, таксама, дарэчы, ураджэнец брэсцкай зямлі. І хто лепш за яе мог прывіць сыну навыкі ігры на фартэпіяна, любоў да якога хлопчык адчуў з дзяцінства!

*Вядучы 1*: Імя, асоба, шматгранная дзейнасць і творчая спадчына Напалеона Орды злучаюць, як вядома, некалькі народаў і культур. Ураджэнец Беларусі, з в. Варацэвічы, ён вучыўся ў Вільні, а еўрапейскае прызнанне атрымаў у Парыжы. Орда жыў і працаваў у Кіеве, памёр у Варшаве, а пахаваны ў Беларусі.

*Вядучы 2:* Паводле соцень яго жывапісных малюнкаў у многіх краінах узнаўляецца аблічча колішніх архітэктурных ландшафтаў. Усяго ж яму належыць больш за 1000 архітэктурных замалёвак, і не толькі Парыжа, Мадрыда, Лісабона, але і гарадоў, маёнткаў Літвы, Польшчы, Украіны і Беларусі, у тым ліку краявідаў Гродзенскага краю. Пэндзлю мастака належыць у цэлым больш за 200 палотнаў, прысвечаных роднай Беларусі.

*Чытальнік:* верш Л.Тарасюка “Іншасвет Напалеона Орды”:
Там замак быў, а тут — тужыў паэт,
І на гравюры гэтай штосьці імглціца...
Мастак малюе свету — іншасвет:
Шляхецтва гнёзды, гожыя капліцы.
Усе, што сэрцам вызначыць паспеў..;
Паспеў. Але ж якія орды
Прайшлі наскрозь праз памяці пастэль
На літаграфіі Напалеона Орды?
Яшчэ гучаў расстання паланез -
Як лес выгнанца пры жывой айчыне.
І на сядзібе роднай сіні бэз
Глядзеў у свет вільготнымі вачыма.

*Вядучы 1:* Нарадзіўся Напалеон Орда ў 1811 г. у Варацэвічах Пінскага павета ў спадчынным маёнтку. (*Дэманструецца партрэт Н. Орды)* Вучыўся ў Свіслацкай гімназіі, уваходзіў у тайнае таварыства “Заране”. З Віленскага ўніверсітэта быў выключалі як нядобранадзейны. Служыў ў войску калі ўспыхнула паўстанне 1830 г., стаў на бок паўстанцаў. За баявыя заслугі быў ўзнагароджаны вышэйшым ордэнам паўстанцаў “Залаты крыж”. Расійскія ўлады завочна прысудзілі яго да пакарання смерцю. Таму пасля паражэння паўстання Орда эмігрыраваў і ў 1832 г. апынуўся ў Парыжы.

Вядучы 2: Неардынарны таленавіты ліцвін хутка быў заўважаны. Сярод яго асабістых сяброў Ферэнц Ліст, Адам Міцкевіч. Пад кіраўніцтвам Шапэна Орда ўдасканальвае фартэпіяннае майстэрства. (*Ціха пачынае*

*гучаць музыка Шапэна.*) У парыжскіх салонах даволі часта выступалі сябры-кампазітары і піяністы: Фрэдэрык Шапэн і Напалеон Орда, нярэдка з розыгрышамі публікі: выконвалі творы адзін аднаго без абвяшчэння аўтарства. Так, цяжкае выпрабаванне для аматараў...

*Вядучы 1*: У 1840-я гг. з парады Шапэна і Ліста Орда надрукаваў свае фартэпіянныя і вакальныя творы. Больш за 20 паланезаў, мноства мазурак, вальсаў, накцюрнаў, полек, серынад — такая кампазітарская спадчына Напалеона Орды. Але перавагу Н. Орда аддаваў жанру паланэза. Сярод іх паланезы з рысамі баркаролы, накцюрну, маршу, канцэртны паланэз для аркестра, паланэз памяці Шапэна, паланез «Паўночная зорка» і іншыя.

*Гучыць запіс паланеза Н. Орды "Паўночная зорка"*

*Вядучы 1:* Павінен быў прайсці час даўжынёй амаль у два стагоддзі, каб на радзіме ўспомнілі і прызналі сусветна вядомага кампазітара, пісьменніка, мастака, чые малюнкі ўпрыгожваюць турыстычныя даведнікі і, як адзінае сведчанне, даюць уяўленне аб палацах, замках, храмах Еўропы, больш паловы якіх сёння няма. Яны разбураны і захаваліся толькі на палотнах Напалеона Орды - бясцэннай і адзінай крыніцы для рэстаўрацыйных работ, музеефікацыі мясцін, звязаных са славутымі людзьмі мінулага.

*Вядучы 2:* Ды і музычныя творы, выдадзеныя яшчэ пры жыцці кампазітара ў Польшчы і Францыі, толькі на 200-годдзе з дня нараджэння Напалеона Орды загучалі на яго Бацькаўшчыне, ля сваіх вытокаў.

*Чытальнік:* верш У. Мазго "Беларускі Напалеон"

З паўзабытай мінуўшчыны ён
Нам адкрыўся, як воблак на фрэсцы.
Беларускі Напалеон
Паланіў нашы прагныя сэрцы.
Адрадзіў людзям памятку дзён
Непаўторных, што гукі ці фарбы.
Беларускі Напалеон
Нам вярнуў старадаўнія скарбы.
Патрыётам радзімы здавён
Пачуваўся і шчодра, і горда
Беларускі Напалеон з дзіўным імем
І прозвішчам Орда.
Ён пакінуў свой оперны плён
У Парыжы і пушчах галёкаў.
Беларускі Напалеон
Да палескіх вярнуўся вытокаў.

Захапіў нашы сэрцы ў палон,
Бо прыйшоў, калі шчыра прызнацца,
Беларускі Напалеон
Не з мячом, а з высокім мастацтвам.

*Гучыць полька Н.Орды*

*Вядучы 1:* Прырода шчодра адарыла Напалеона Орду талентамі, і толькі абставіны не далі на поўніцу раскрыць іх. У ім дзіўным чынам спалучаліся мастацкія і музычныя эдольнасці, дзелавітасць і рамантызм. Калі б Напалеон Орда прысвяціў сябе служэнню аднаму са сваіх дараванняў, то, магчыма, дасягнуў бы большых поспехаў, мог стаць вялікім кампазітарам ці мастаком. Сваёй living рознабаковасцю і універсальнасцю ён быў падобны на тытанаў эпохі Адраджэння, а для беларускай культуры XIX ст. ён і сапраўды стаў тытанам.

*Вядучы 2:* Гісторыю, як вядома, ствараюць людзі. Ствараюць не толькі ў той час, калі жывуць, але з далечы мінулага ўплываюць на дзень сённяшні і будучы. У сузор'і светлых імён выдатных беларусаў не павінна згубіцца зорка Напалеона Орды.

*Чытальнік:*верш Р. Баравіковай “Да графічных малюнкаў Напалеона Орды”

Застылі дрэвы ў вечным карагодзе,
Я ў нейкі міг задам пытанне ім:
Чаму не нарадзілася ў стагоддзі
Тым самым, што было калісь Тваім?

Нас бы адна вяла любоў і вера,
І там, дзе мур стары трывожыць бэз,
Мой верш сагрэў бы сэрца касінера,
І ў твой бы папрасіўся паланэз.

Які не для мяне гучаў, напэўна,
Каб рэхам заміраць пасля ў лісці…
Але зліецца дух мой з даллю спеўнай,
Куды ўжо не дабегчы, не дайсці.

Парыў душы тугой гады праніжа
І ляжа сном на цяжкіх дзён асцё:
Ты – тут. Ты – побач. Сонца над Нясвіжам.
І ў неба шле свій чысты звон касцёл…

# "МАСТАК И ГОРАД"

*Схема кніжнай выставы,*
*прысвечанай гораду Гродна ў малюнках Н. Орды*

*Сёння вядома каля 1150 малюнкаў і акварэляў Напалеона Орды. Сярод іх каля 40 з выявамі Гродна.*



**1 частка.** Размяшчаюцца друкаваныя і электронныя матэрыялы аб знаходжанні Н. Орды ў Гродне.

- Акаловіч, Л. Да радаводу Напалеона Орды // Краязнаўчая газета. — 2010. — №8.– С.5. – №9. – С. 5.
- Гапоненка, В. Напалеон Орда (1807 – 1883) Славутыя імёны Бацькаўшчыны. – Мн., 2000. – Вып.1. – С. 220-222.
- Каламійцаў, А.А. "Край на паперы", ці Творчасць Напалеона Орды па захаванню Радзімы // Актуальные проблемы мировой художественной культуры : материалы Междунар. науч. конф. – Гродно, 2006. – Ч. 2. – С. 67-69
- Карлюкевіч, А. Свіслач, Поразава, Шамятоўка // Карлюкевіч, А. Радзімазнаўства. Мясціны. Асобы : краязнаўчыя нарысы / Алесь Карлюкевіч. – Мінск, 2010. – С. 148-152.
- Синевич, А. По следам Наполеона Орды // Вечерний Гродно.– 2007.– 12 сент.– С. 26
- Чернякевич, А. Художник и Город / Андрей Чернякевич, Андрей Вашкевич ; фото // Вечерний Гродно. – 2013. — 27 февр. — С. 29.

**2 частка.** Змяшчаюцца раздрукаваныя копіі малюнкаў Н. Орды з выявамі Гродна. Малюнкі групуюцца па наступных напрамках: культавыя пабудовы, агульная панарама Гародні, архітэктура XVIII ст., замкі, помнікі грамадскага значэння.

## *ЗМЕСТ*

**Біяграфічныя звесткі ........ 1**

**Напалеон Орда — мастак ........ 5**

**Напалеон Орда — кампазітар........ 6**

**Напалеон Орда — педагог ........ 7**

**Напалеон Орда — лінгвіст........ 7**

**Напалеон Орда і Гродна........ 8**

**Прыклады назваў кніжных выстаў, прысвечаных творчасці Напалеона Орды........ 9**

**"Чалавек з незвычайнай біяграфіяй": Сцэнарый літаратурна-музычнай гасцёўні........ 10**

**“Мастак і горад": Схема кніжнай выставы ........ 14**

